Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:56 PM Page 3

*Жыве Беларусь!*

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225 Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 568 Травень 2010 г.
Год выданьня 60

## 27-я Сэсія Рады БНР



У Лёндане адбылася 27-я сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

Удзельнікі сэсіі ўшанавалі хвілінай цішы памяць ахвяраў авіяцыйнай катастрофы пад Смаленскам, сярод якіх былі прэзыдэнт Польшчы Лех Качыньскі з жонкаю і Рышард Качароўскі, апошні прэзыдэнт Польшчы ў выгнаньні.

Былі заслуханыя справаздачы кіраўніцтва Рады і сэктараў. Асаблівая ўвага была нададзеная падтрымцы адукацыйнай і культурніцкай дзейнасьці ў Беларусі, спрыяньню росту нацыянальнай сьвядомасьці.

Удзельнікі сэсіі разгледзелі плян дзеяньняў на бліжэйшы час і пэрспэктывы супрацоўніцтва з палітыкамі ЗША, Канады і эўрапейскіх краінаў, а таксама зь міжнароднымі арганізацыямі.

Сэсія Рады БНР прыняла рэзалюцыю супраць будаўніцтва АЭС на тэрыторыі Беларусі.

У адпаведнасьці са Статутам Рады, адбыліся выбары кіраўніцтва. Старшынёю Рады Беларускае Народнае Рэспублікі была чарговы раз пераабраная Івонка Сурвілла.

***Паводле Радыё Свабода***

## Уладыка наведаў Адэляйду

Япіскап Сьвятаслаў прыехаў у Адэляйду раніцай 27 сакавіка 2010 году. Сустрэў яго старшыня парафіяльнай рады мясцовай БАПЦ Мікалай Кандрусік. Мікалай разам з жонкай Галінай утрымоўвалі высокага госьця падчас ягонага нядоўгага побыту ў штаце Паўднёвай Аўстраліі. У суботу Ўладыка наведаў магілы архіяпіскапа Сяргея і айца Міхаіла (Бурноса.

У наступны дзень архіяпіскап БАПЦ прысутнічаў на багаслужбе, якую вёў настаяцель айцец Яўген (УАПЦ) і потым, ужо ў прыцаркоўнай залі паінфармаваў вернікаў аб парафіях БАПЦ ў ЗША і Канадзе, аб становішчы БАПЦ у Беларусі і Ўкраіне, аб друкаваных выданьнях і плянах на будучыню.

Уладыка пакінуў Адэляйду ўвечары 28-га сакавіка.

***Віктар КАВАЛЕЎСКІ***

***На здымку:** ля магілы архіяпіскапа Сяргея стаяць Уладыка Сьвятаслаў, Мікалай Кандрусік і Галіна Кандрусік.*

***Фота Віктара Кавалеўскага.***



# Зь дзейнасьці БЭЗ

***Паводле БЭЗ-info***

## Чарнобыльскія пікеты

Удзень памяці ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы, 26 красавіка, Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне арганізавала пікеты, якія адбыліся ля беларускай амбасады ў Бэльгіі і насупраць будынкаў Эўрапейскіх інстытуцыяў. Падчас пікетаў была распаўсюджаная вялікая колькасьць улётак на розных эўрапейскіх мовах.

Пікетоўцы хацелі нагадаць сваім суайчыньнікам і жыхарам Эўрапейскага Зьвязу аб тым, што мірны атам ва ўмовах нестабільнасьці перастае быць мірным і нясе сьмерць ня толькі асобнаму чалавеку ці групе людзей, але і ўсёй сям'і народаў, ставячы пад пагрозу існаваньне ўсяго чалавецтва.

Сёньня Беларусь, краіна найбольш пацярпелая ад "мірнага" атаму, знаходзіцца пад ўладай неадэкватнага дыктатара Лукашэнкі і правапераемнікаў КДБ – крамлёўскіх эспэрымэнтатараў, і таму яе стан нестабільны, а будучыня нявызначаная. Гістарычная памяць змушае нас, беларусаў, біць трывогу і папярэджваць народы Эўропы аб небясьпецы, якую ўтойвае ў сабе выбуховая сумесь "атам – дыктатура – кгб – крэмль", якая ня мае павагі ні да волі, ні да правоў чалавека, ні да самога чалавечага жыцьця.

Паўзучая легітымізацыя рэжыму Лукашэнкі эўрапейскімі ўрадавымі структурамі падахвочвае заклікаць простых эўрапэйскіх жыхароў і грамадзкія арганізацыі дапамагчы ў супрацьстаяньні гэтай дзіўнай гульне эўраструктураў з дыктатарам. Выгада асобных прагматыкаў немінуча абернецца трагедыяй для нас і будучых пакаленьняў, як гэта ўжо было ў гісторыі, напрыклад, з тым-жа Гітлерам, мэтадамі кіраваньня якога яшчэ нядаўна захапляўся А. Лукашэнка.

## Пікет у Брусэлі

Напярэдадні вынясеньня прыгавору палітычнаму вязьню Міколе Аўтуховічу, 5 траўня, радными БНР у Бэльгіі быў зладжаны пікет салідарнасьці зь вязьнямі сумленьня ў Беларусі. Актывістамі Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня была распаўсюджаная вялікая колькасьць улётак на ангельскай і французкай мовах.

Удзельнікі пікету былі прыемна ўражаныя, калі да пікетоўцаў падыйшоў старшыня Эўракамісіі Жозэ Мануэл Баррозу і ўзяў улётку. Выпадак, калі чыноўнік такога рангу проста крочыць па вуліцы і гутарыць зь мінакамі, сьведчыць пра высокі ўзроўнем дэмакратычнасьці эўрапеўскіх палітыкаў.

Супрацоўнікі эўрапейскіх інстытуцыяў паказалі вялікую цікаўнасьць да зьместу ўлётак. Падчас пікету былі дадзеныя кароткія інтэрвію журналістам розных СМІ.



## Пікет у Гаазе

Актывісты Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня ўзялі ўдзел у пікеце, што праводзіўся ў Гаазе 16 траўня 2010 году грамадзянскай ініцыятывай "Мы помнім". У акцыі ўзялі ўдзел беларускія палітычныя уцекачы, якія сёньня жывуць у Нідэрляндах.

Удзельнікі пікету трымалі плякаты з партрэтамі зьніклых беларускіх палітыкаў, а таксама плякат з надпісам "Сяргей Каваленка – герой, Лукашэнка – злодзей!"



Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:56 PM Page 4



# Чарнобыльскі мітынг

У нядзелю, 25 красавіка 2010 году, Нью-Ёрскі аддзел Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня і Згуртаваньне Беларускай Моладзі ў Амэрыцы зладзілі мітынг на Мангэтане, прысьвечаны 24-й гадавіне Чарнобыльскай катастрофы. Удзельнікі сабраліся каля гатэлю Пляза на 5-й вуліцы. Моцны дождж не перашкодзіў мітынгоўцам адзначыць гадавіну страшнае катастрофы, якая ў той ці іншай ступені закранула амаль кожную беларускую сям’ю.



Напачатку мітынгу ўдзельнікі выказалі салідарнасьць з суродзічамі, што жывуць на забруджаных тэрыторыях, зь перасяленцамі з зонаў забруджваньня, ліквідатарамі наступстваў аварыі.

Асаблівасьцю мітынгу сталі выступы сябраў арганізацыяў, якія асабіста пацярпелі ад наступстваў Чарнобылю. Праз прызму чужой трагедыі шмат хто з удзельнікаў па-іншаму паглядзеў на тое, што адбылося 24 гады таму, калі бальшыня прысутных яшчэ нават не нарадзіліся. Выступы былі вельмі эмацыйныя з прычыны таго, што сем’і шмат каго з выступоўцаў асабіста пацярпелі ад аварыі ў 1986 годзе, а пасьля ад пазбаўленьня іх ільготаў рэжымам Лукашэнкі.

**Сяргей Ермакоў** (сябра ЗБМА): У Беларусі я жыў у Горадні, куды мая сям’я была пераселеная з Брагіну (Гомельская вобласьць). Мой дзядуля быў ліквідатарам аварыі. Пасьля гэтага, ён хутка захварэў на лейкемію. Перасяленьне абярнулася трагедыяй для тысячаў беларускіх сем’яў, якія былі вымушаныя пакінуць тыя месцы, дзе жылі іхныя продкі. Цяперашняя палітыка Лукашэнкі на чарнобыльскіх тэрыторыях па іх гаспадарчаму асваеньню вельмі небясьпечная. Забруджаныя прадукты трапляюць на сталы беларускага насельніцтва, працягласьць жыцця якога і так нашмат меншая за сярэднееўрапейскую.

На наступны дзень тры асобы (М. Давідзюк, В Галянкова, В. Бабіч) адведалі офіс мэра Нью-Ёрку Майкла Блюмбэрга, куды перадалі зварот з інфармацыяй аб Чарнобылі і Беларусі.

**Марына Давідзюк**: Мэта візыту у офіс мэра – чарговы раз прыцягнуць увагу амэрыканскага грамадзтва ды тых выпрабаваньняў, якія напаткалі Беларусь. Чым больш людзей будзе ведаць пра нашую краіну, яе людзей, і праблемы, тым большы міжнародны супраціў будзе сустракаць антынацыянальная палітыка Лукашэнкі. Пільная міжнародная ўвага да палітыкі Лукашэнкі – гэта адзін са шляхоў абароны нашай краіны.

*М. ЦІМАШЭНКА*

# Парафіяльнае сьвята ў Кліўлэньдзе



*У нядзелю, 16 траўня, у Кліўлэндзкай царкве Божай Маці Жыровіцкай адбылося парафіяльнае сьвята.*

*Міхась КАЛЯДКА*

# Сьвята на Прэстан авэню

На Прэстан авэню ў Скарбара каля Таронта 25 красавіка панавала незвычайнае ажыўленьне. Аўты пад’яжджалі адно за другім. Зь іх выходзілі прыгожыя людзі з прасьветленымі тварамі. Цёплыя прывітаньні, пацалункі, усьмешкі. Але самае прывабнае і прыемнае – шмат хто з іх у прыгожых і разнастайных беларускіх строях. І нават дзьвюх аднолькавых нябачна...



Грамада з прыглушаным гоманам павольна накіроўваецца да адной з хатаў. Першае, што сустракае гэты незвычайны для простае канадыйскае вуліцы экіпіраваны гурт асобаў, – вялікі бел-чырвона-белы сьцяг, які зьвісае ад самае столі да падлогі вэранды. Людзі падымаюцца па прыступках, адчыняюцца дзьверы ў хату і...хваля чалавечых пачуцьцяў абрынулася на сталую кабету ў чырвонай жакетцы.

...Спадарыня Марыя Ганько ў сваёй хаце ў свой дзень нараджэньня сустракала гасьцей. У той дзень быў яе юбілей, і шмат хто выказаў жаданьне павіншаваць нашую Марылю пэрсанальна, выказаць добрыя словы Жанчыне. Так, менавіта Жанчыне зь вялікае літары.

Букет найпрыгажэйшых ружаў, складзены ў выглядзе бел-чырвона-белага сьцягу (дзякуй таму, хто такую ідэю падаў і ажыцьцявіў), прыгожы торт з надпісам, падарункі і падаруначкі.

Гучалі “Доўгія лета!” і “Сто лят!”’.

Сп-ня Ганько квітнела. Цёплае вершаванае віншаваньне вядомае беларускае пісьменьніцы Вольгі Іпатавай, прамова пра шлях імяніньніцы да Канады з віншаваньнем ад імя Галоўнае управы Згуртаваньня Беларусаў Канады і Рады парафіі сьв. К. Тураўскага, а таксама вершаваная заключная частка расчулілі сп-ню Ганько да сьлёз. Яна ўжо толькі і магла, што паўтараць: “Дзякуй усім, вялікі вам дзякуй, даражэнькія!”

А потым былі беларускія сьпевы ў выкананьні Валянтыны Шаўчэнка і Надзеі Дробінай. Ім дапамагалі ўсе, хто здольны. А здольнымі аказаліся ўсе, хто знаходзіўся тады ва ўтульнай хатцы Ганькоў.

Дарэчы, намаганьнямі Сяржука Паўзуна былі падабраныя сьпевы, запісаныя на дыскі, набыты DVD плэер, і усё тое было прэзэнтаванае сп-ні Ганько, каб яна мела магчымасьць цешыць сябе такімі мілымі яе сэрцу беларускімі мэлёдыямі.

Як і бывае у такіх выпадках, пасьля афіцыйнае часткі госьцей запрасілі да стала. Ну а які-ж стол бяз чаркі! Добрых тостаў, смачнага торту...

Беларуская гамонка ў хаце, дзе ўсё дыхае беларушчынай, доўжылася яшчэ даволі працяглы час.

Як прыемна рабіць людзям прыемнае!

Вялікая падзяка ўсім, хто спрычыніўся да арганізацыі такога цудоўнага сьвята для гаспадыні беларускае хаткі на Прэстан авэню.

Калі мы разам – ніколі параза. Заўжды перамога!

*А. КОТ*

# Зьмена ў палітыцы ЗША

Выглядае, што Вашынгтон гатовы перайсьці да маўклівай нэйтральнасьці ў адносінах да Беларусі. Адзінаю перашкодаю падаецца прыватнае пытаньне амбасады.

Крокі Вашынгтону выразна паказваюць на зьмену курсу ў дачыненьні да Беларусі. Была падтрымка праз МВФ – 3,5 мільярды. Зьмянілася стаўленьне да беларускай палітычнай апазыцыі. Ад пэўнае пары яе, хутчэй, ігнаруюць.

З чым звязаная перамена? Няма двух варыянтаў адказу: з курсам Менску на незалежнасьць ад Масквы. Лукашэнку не ўдалося скалупнуць, значыць, варта зь ім лічыцца. Не рэвалюцыя, а набліжэньне. Менск ня будзе праціўнікам, пакуль ня будзе ўлазіць у антыамэрыканскія авантуры. Такой выглядае палітыка Абамы да Беларусі. Абамы, першыя крокі якога Лукашэнка вітаў.

Ах так, ёсьць прыватнае пытаньне амбасады, зь якога беларускія ўлады выгналі дыпляматаў. Гонар не дазволіць ЗША заплюшчваць на гэта вочы. Аднак у выпадку вырашэньня пытаньня з амбасадаю нармалізацыя адносінаў з ЗША падаецца рэальнай.

Стаўленьне ЗША да пытаньняў дэмакратыі ў Беларусі тады можа “аэрбайджанізавацца”. Гэта значыць, прынцыповая падтрымка правоў чалавека, але без настойваньня на палітычных пераменах. І гатоўнасьць да разьвіцьця эканамічных кантактаў.

Апазыцыі прыйдзецца прыстасавацца да новай дадзенасьці, якая можа зацягнуцца аж да зьмены курсу ў Вашынгтоне ці ў Менску. На першае апазыцыя ўплываць ня можа – хоць і цешыць сябе такой ілюзіяй, а вось другое цалкам у беларускіх руках.

У кожным разе, нармалізацыя адносінаў з ЗША дасьць Беларусі дадатковыя аргумэнты ў няпростым дыялёгу з Масквою. Незалежнасьць ад таго ўмацуецца, дэмакратыя адкладаецца на пасьля.

*Паводле «Нашай Нівы»*

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:56 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Чарнобылькі шлях-2010

Актывісты палітычных партый і грамадзкіх арганізацыяў зладзілі ў Менску 26 красавіка традыцыйны "Чарнобыльскі шлях", прымеркаваны да 24-гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Арганізатары і ўдзельнікі сабраліся на пляцы каля НАН. Але многія так і ня здолелі прысутнічаць на кароткім мітынгу на прыступках будынку, бо падыходы былі ачэпленыя турнікетамі і патрапіць у цэнтар падзеяў магчыма было толькі праз рамкі мэталашукальнікаў і асабісты дагляд. Імпрэзу распачаў вядомы бард Андрэй Мельнікаў, затым выступілі праваабаронца Людміла Гразнова, навуковец Іван Нікітчанка, якія заявілі пра замоўчваньне ўладамі праблемаў Чарнобылю, пра палітычны і духоўны чарнобыль у Беларусі.



Здымак У. Цярохіна

Арганізатары заклікалі ўдзельнікаў вярнуць акцыі статус жалобнай імпрэзы ў памяць ахвяраў трагедыі. Гэты заклік быў пачуты і ўдзельнікі прыйшлі на акцыю без партыйных сьцягоў і іншай атрыбутыкі, а выключна зь бел-чырвона-белымі сьцягамі з чорнымі стужкамі і плякатамі на тэму Чарнобыля. Адзін з арганізатараў, Зьміцер Дашкевіч, абвясьціў, што адною з мэтаў акцыі ёсьць стварэньне грамадзкага камітэту "У абарону жыцьця".

У канцы мітынгу ўдзельнікі правялі пэрформанс, зваяваўшы пудзіла сьвіньні з плякатам "Накармлю Беларусь радыяцыяй". Затым яны прайшлі па маршруту – праспэкт Незалежнасьці – вуліца Сурганава – капліца ахвярам Чарнобылю. Увесь час іх суправаджалі АМАП і супрацоўнікі міліцыі ў цывільным. Акцыю віталі сыгналамі зь легкавікоў, а таксама бел-чырвона-белымі сьцягамі людзі з бальконаў. Яшчэ адной асаблівасьцю сёлетняй акцыі сталася тое, што сярод арганізатараў і ўдзельнікаў не было старшыняў партыі БНФ і АГП.

"Чарнобыльскі шлях" ягоныя ўдзельнікі завяршылі каля капліцы хвілінай цішы, малітвай і сьпевам гімну "Магутны Божа". Жалобная акцыя прайшла без затрыманьняў.

*Паводле Радыё Свабода*

## Рэпрэсіі ўзмацняюцца

18 траўня міліцыя правяла ператрусы з канфіскацыяй аргтэхнікі (перадусім кампутараў і ноўтбукаў) па ўсёй краіне ў актывістаў грамадзкай кампаніі "Гавары праўду". Ператрусы прайшлі, як у Менску, так і амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Прычым ператрусы былі ня толькі ў абласных гарадах, але і ў Барысаве, Бабруйску, Бялынічах, Рэчыцы, Ваўкавыску ды інш. У Менску былі затрыманыя лідэр кампаніі пісьменьнік Уладзімер Някляеў, рэдактар апазыцыйнай газэты "Товарищ" Сяргей Вазьняк, журналіст Аляксандар Уліцёнак, палітоляг Сьвятлана Навумава. Быў таксама праведзены ператрус на офісе аўтарытэтнай сацыялягічнай службы "Новак" Андрэя Вардамацкага. Што да шараговых актывістаў, то схема затрыманьня была такая: затрыманьне на офісе, а потым ператрус на кватэры. Так з мэтаю "знайсьці рэчы, здабытыя злачынным шляхам" прыйшлі да палітоляга і выдаўца Аляксандра Фядуты.

Міліцыя казала, што ўсе ператрусы і затрыманьні ідуць нібыта ў рамках расьследаваньня крымінальнай справы паводле арт. 250 "Распаўсюд ілжывай інфармацыі пра тавары і паслугі".

Калі большасьць удзельнікаў кампаніі пасьля дачы паказаньняў адпусьцілі, то Сяргея Вазьняка і міжнароднага сакратара Аб'яднанай грамадзянскай партыі Андрэя Дзьмітрыева затрымалі на трое сутак і адвезьлі ў сьледчы ізалятар на Акрэсьціна.

Найбольш трагічная была сытуацыя зь лідэрам кампаніі Уладзімерам Някляевым. Ён быў затрыманы на офісе "Гавары праўду", потым яго адвезьлі дахаты, дзе быў праведзены грунтоўны ператрус і канфіскаваныя два ноўтбукі і ўсе флэш-драйвы. Ноч грамадзкі лідэр правёў у Ленінскім РУУС. На наступны дзень, 19 траўня, адбыўся допыт пісьменьніка. Паводле ягонага адваката Мар'яны Сямешкі, заведзеная крымінальная справа па артыкуле 250 – "Распаўсюд ілжывай інфармацыі пра тавары і паслугі". Някляева затрымалі на трое сутак і адвезьлі ў сьледчы ізалятар на Акрэсьціна. Паводле зьвестак на вечар 19 траўня, ня выключана, што тэрмін затрыманьня будзе падоўжаны.

Удзень 19 траўня ацалелыя ўдзельнікі грамадзкай кампаніі правялі прэс-канфэрэнцыю, дзе заявілі, што будуць працягваць сваю дзейнасьць, а таксама адхрысьціліся ад абвінавачваньняў, што кампанія "Гавары праўду" фінансуецца з Расеі. Такія чуткі, дарэчы, цыркулююць ад самага пачатку кампаніі.

Палітолягі і праваабаронцы мяркуюць, што выпадак з кампаніяй "Гавары праўду" ня будзе адзінкавым, а па меры набліжэньня прэзыдэнцкіх выбараў, рэпрэсіі будуць узмацняцца.

## Прэзыдэнцкія выбары

Кіраўнічка Цэнтарвыбаркаму Беларусі Лідзія Ярмошына не выключае, што прэзыдэнцкія выбары пройдуць гэтай восеньню. Так, у адпаведнасьці з заканадаўствам, прэзыдэнцкія выбары, гэта юрысдыкцыя парлямэнту, маюць быць прызначаныя не пазьней, чым за пяць месяцаў і быць праведзеныя ў нядзелю не пазьней, чым за два месяцы да заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга прэзыдэнта. Такім чынам, крайні тэрмін правядзеньня прэзыдэнцкіх выбараў – 6 лютага 2011 году.

"Вядома, выбары было-б зручней правесьці да Новага году. Быў-бы іншы настрой у грамадзтве", – сказала Ярмошына.

На думку аналітыкаў, прызначэньне выбараў на восень выгаднае ўладам, бо зблытае карты палітычных апанэнтаў Лукашэнкі. Адзіным кандыдатам пакуль і не пахне, апазыцыя цяпер разьяднаная, і датэрміновы старт выбарчай кампаніі можа даць істотную перавагу дзейнаму кіраўніку дзяржавы. Апроч таго, на карысьць Лукашэнкі можа спрацаваць і эканамічны фактар. З новага году могуць зноў падаражаць энэрганосьбіты, урад узяў курс на штучнае падвышэньне заробку да $500 (зараз – $360). Таксама ўстанаўленьне ільготаў пэнсіянэрам і студэнтам ды іншыя прыгожыя эканамічныя жэсты могуць прывесьці ў пачатку наступнага года да эканамічнага каляпсу.

Праўда, Лукашэнка ў інтэрвію інфармацыйнаму агенцтву "Рэйтэр" казаў, што на ягоную думку, выбары найлепей правесьці ў пачатку 2011 года.

Пра свой удзел у будучай прэзыдэнцкай кампаніі заявілі: кааардынатар "Хартыі'97" Андрэй Саньнікаў, дэмакратычныя экскандыдаты ў прэзыдэнты на выбарах 2006 году Аляксандар Мілінкевіч і Аляксандар Казулін, лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч, які браў удзел у выбарах 2001 і 2006 гадоў, сустаршыня аргкамітэту па стварэньні БХД Віталь Рымашэўскі, былы намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч. Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ настойвае на байкоце выбараў. Аляксандар Лукашэнка афіцыйна пакуль не абвясьціў пра тое, што ідзе на выбары, але эканамічныя прыкметы пра гэта яскрава сьведчаць.

Партыя БНФ назаве свайго кандыдата на зьезьдзе 29 траўня. Найхутчэй ім стане намесьнік старшыні Партыі Рыгор Косьцікаў. Таксама павінна назваць свайго кандыдата і Аб'яднаная грамадзянская партыя. Няясна, на каго ставіць – асабліва ў зьвязку з апошнімі падзеямі – грамадзянская кампанія "Гавары праўду!" (Уладзімер Някляеў).

## Тры гады ўмоўна

Нагадаем, што актывіст Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ С. Каваленка вывесіў 7 студзеня на галоўнай ялінцы Віцебску велізарны нацыянальны сьцяг. У той-жа дзень ён быў арыштаваны, зьбіты і зьмешчаны ў ізалятар, але прaзь некалькі дзён адпушчаны.



Суд прайшоў 12–14 траўня. Пракурор патрабаваў пакараць Каваленку трыма гадамі "хіміі", але судзьдзя пастанавіў пакараць грамадзкага актывіста трыма гадамі зьняволеньня ўмоўна. Таксама Каваленка павінен заплаціць кампэнсацыю міліцыянтам, якія яго затрымлівалі.

Адмаўляцца ад грамадзкай дзейнасьці актывіст не зьбіраецца.

## Аўтуховіча асудзілі

6 траўня ў Вярхоўным судзе быў вынесены прысуд ваўкавыскім прадпрымальнікам Мікалаю Аўтуховічу і Уладзімеру Асіпенку, а таксама міліцыянту Міхаілу Казлову. Нагадаем, што ад лютага 2009 году прадпрымальнікі знаходзіліся за кратамі, іх абвінавачвалі ў тэракце (спробе замаху на гарадзенскага губэрнатара Саўчанку і ліквідацыі намесьніка міністра па падатках і зборах Віктара Камянко), а таксама падпалах маёмасьці ваўкавыскіх чыноўнікаў. Абвінавачваньне Аўтуховіча, які валодаў фірмай таксі, грунтавалася на паказаньнях ягонага былога супрацоўніка Аляксандра Ларына. Міхаіла Казлова абвінавачвалі ў тым, што ён ведаў пра замах, але не данёс.




М. Аўтуховіч

Пракурор Сафараў заклікаў пакараць Аўтуховіча 20 гадамі турмы. Журналісты, што прысутнічалі на абвяшчэньні прысуду, былі шакаваныя. Абвінавачваньні ў тэрарызме, замаху на жыцьцё чыноўнікаў, падпалах дамоў былі зьнятыя за бяздоказнасьцю, а некаторыя паказаньні Ларына суд палічыў няпраўдзівымі. Не зьнялі толькі абвінавачваньне ў захоўваньні зброі: пры ператрусе ў Аўтуховіча знайшлі паляўнічую стрэльбу і пяць патронаў.

У выніку Аўтуховіча асудзілі на пяць гадоў і два месяцы калёніі строгага рэжыму, Уладзімер Асіпенка і Аляксандар Ларын атрымалі па тры гады, Міхаіл Казлоў – два.

Праваабаронцы мяркуюць, што неўзабаве Асіпенка і Казлоў могуць апынуцца на волі, а Аўтуховіч будзе вызвалены праз два гады ўмоўна-датэрмінова.

## Беларускі інтэрнацыянал

У Беларусі жывуць прадстаўнікі 140 нацыянальнасьцяў. Пра гэта журналістам заявіў прэссакратар апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Міхаіл Рыбакоў. Агучаная лічба ўзятая з апошняга перапісу насельніцтва.

"У Беларусі няма нейкіх асобна ўзятых нацыянальнасьцяў, якія маглі-б адчуваць сябе абдзеленымі, – зазначыў Рыбакоў. – Ёсьць адзіны народ Рэспублікі Беларусь – і ў прадстаўніка любой нацыянальнасьці, якая ўваходзіць у склад гэтага народу, ёсьць права на сваю культурную разнастайнасьць. Галоўная задача ў тым, каб гэтая сытуацыя захавалася, і каб гэтыя традыцыі разьвіваліся і надалей".

## Вайцюшкевіча запрасілі

Вядомы сьпявак Зьміцер Вайцюшкевіч запрошаны ў якасьці аднаго з салістаў Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестру імя Жыновіча.

У плянах артыста – запісаць з аркестрам сольную праграму. Таксама выканаўца сыграе адну з галоўных роляў у пастаноўцы рок-опэры Ігара Лучанка "Гусьляр", вядомую з дыска 1970-х "Песьняроў". Плянуецца, што Вайцюшкевіч сыграе ролю галоўнага адмоўнага пэрсанажу – князя.

## Помнік У. Караткевічу

У сталіцы цягам 2010–2011 гадоў заплянаванае ўзьвядзеньне помніка клясыку беларускай літаратуры Уладзімеру Караткевічу (1930–1984). Гэта прадугледжвае плян падрыхтоўкі і сьвяткаваньня 80-годзьдзя з дня нараджэньня пісьменьніка. У пляне, зацьверджаным міністрам культуры Паўлам Латушкам, адзначаецца, што помнік павінен быць пабудаваны са сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, а адказнасьць за выкананьне ўскладзена на Мінкультуры і Менгарвыканкам.

Усяго плян уключае 23 мерапрыемствы, сярод якіх упарадкаваньне дома-музэя Караткевіча ў Оршы, а таксама разьмяшчэньне на вуліцах сталіцы білбордаў зь ягоным партрэтам і надпісам "80 год з дня нараджэньня клясыка беларускай літаратуры У. Караткевіча». Будзе таксама зьняты чатырохсэрыйны мастацкі фільм паводле раману "Каласы пад сярпом тваім".

## На 10-м месцы

Беларускія гакеісты (галоўны трэнер – Эдуард Занкавец) на чэмпіянаце сьвету па гакеі ў Нямеччыне (7–23 траўня) занялі 10-е месца. Беларусы перамаглі каманды Казахстану (5:2), Даніі (2:1) і гаспадароў спаборніцтваў у овэртайме (2:1), прайгралі Славакіі (2:4), Расеі (1:3), Фінляндыі (0:2). Але галоўную задачу не выканалі, у чвэрцьфінал, як летась, не прабіліся.

*Уласны карэспандэнт*

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:56 PM Page 6



# Дыскусія ў Бэрліне

Намаганьнямі галярэі "Nikalai", што месьціцца ў цэнтры Бэрліну, адбылася дыскусія аб стане сучаснага мастацтва "Мадэрнізм учора, сёньня... заўтра?" У ёй удзельнічалі, з аднаго боку выхадцы зь Беларусі – уладальніца галярэі Іна Пастулка і мастацтвазнаўца Алесь Тарановіч, з другога – нямецкія мастацтвазнаўцы і мастакі.

Нязвыкласьць сытуацыі была ў тым, што фактычна ўпершыню ў наш час у Нямеччыне асуджалася сучаснае мастацтва, былі паказаны ягоны бляск і жабрацтва. Фактычна, гэта было сутыкненьне двух сьветапоглядаў – хрысьціянскага (беларускі бок) і атэістычна-анархісцкага (нямецкі бок).

Мадэрнізм і ягоныя сучасныя мадэфікацыі дамінуюць сёньня ў мастацтве розных эўрапейскіх краінаў. Але менавіта ў Нямеччыне яны набылі статус эстэтызацыі пачварнасьці і пачалі перасьледаваць мэты, нясумяшчальныя з унутранай лёгікай мастацтва. Лёзунг аднаго з правадыроў нямецкага авангарду 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя Курта Швітэрса: "Усё, што я нахаркаю – гэта мастацтва" увайшоў у жыцьцё.

Сёньня шмат псыхічна хворых мастакоў зрабілі сваю незвычайную сьвядомасьць прадметам творчасьці. Гэтым самым яны ствараюць вывісэктарскі экспэрымэнт над гледачом. Цэлае пакаленьне нямецкіх мастакоў сьвядома пайшло на замену агульнапрынятых канонаў прыгажосьці яе гіпертрафаваным эрзацам. У ходзе дыскусіі высьветлілася, што нямецкія мастацтвазнаўцы так і не змаглі знайсьці якія-небудзь пераканаучыя контраргумэнты, а маскіравалі свае пазыцыі навукападобнай фразэялёгіяй. Да таго-ж, у іхным асяродзьдзі не было адзінства. Некаторыя зь іх таксама крытычна ставіліся да творчасьці сучасных нямецкіх мастакоў. У прыватнасьці, "Доктара Сьмерць" – Г. Гагенса, які выстаўляе ў якасьці скульптураў муміфікаваныя чалавечыя трупы.

У сваю чаргу немцам было цікава пачуць думку прадстаўнікоў ня толькі іншага мастацтва, але і іншага мэнталітэту. Даведацца, што Беларусь – гэта краіна, дзе мадэрнізм, як паказаў час, не прыжыўся ў мастацтве. А сусьветнавядомыя ягоныя прадстаўнікі – Марк Шагал, Марк Ротка, Гаім Суцін былі толькі выхадцамі зь Беларусі, але не беларусамі.

**Алесь МАЛАХОЎСКІ**



Алесь Тарановіч і Іна Пастулка.

# Весткі зь Вільні

Як ужо звыкла, у кожную апошнюю суботу кожнага месяцу адбываюцца сустрэчы беларусаў у Таварыстве Беларускай Культуры Літвы ў Вільні. 24 красавіка цікава выступілі журналіст Андрусь Старавойтаў, старшыня ТБК Хведар Нюнька, студэнт гістарычнага факультэту ЭГУ ў Вільні Юрась Юркевіч. Выступоўцамі былі закранутыя цікавыя моманты ня толькі нашай мінуўшчыны, але і аспэкты масмэдыяў у дачыненьні да беларусаў. Было адзначана, што з гэтага месяцу на радыё Палёнія (беларуская рэдакцыя), дзе працуе сп. Старавойтаў уступае ў дзеяньне забарона перакладаць на беларускую мову з расейскай. Можна толькі рабіць пераклады з усіх іншых – інакш пагражае звальненьне з працы. Бачым , што ў краінах Эўропы адбываецца карэкцыя адносінаў зь Беларусьсю. За ўзор вяшчаньня бярэцца вяшчаньне рэспублікі Беларусь. Напэўна адзінае, што могуць рабіць слухачы – дасылаць лісты пратэсту. Усё гэта паказвае, што Эўропа крочыць у бок Лукашэнкі.

Сп. Хведар Нюнька ўзгадаў пра юбілей вядомага беларускага дзеяча Барыса Рагулі. Сёлета спаўняецца 90 гадоў з дня ягонага нараджэньня.

Узгадваючы нашых старэйшых беларусаў сп. Нюнька ўспомніў Зою Коўш. Яна ў свой час многа сілаў аддала працы ў Беларускім Нацыянальным Камітэце. Адсядзела ў лягеры, вярнулася ў Вільню, працавала. А калі зьявілася ТБК, то была актыўнай ўдзельніцай. Мінула ўжо 15 гадоў, як няма яе з намі.

Юрась Юркевіч у сваім выступе раскрыў розныя факты з жыцьця Льва Сапегі, які нарадзіўся пад Віцебскам, вучыўся ў Нясьвіжы, пазьней у Лейпцыгу (вывучаў ва ўнівэрсытэце юрыспрудэнцыю). У 1576 г. Сьцяпан Батура прызначыў яго сакратаром ВКЛ. Леў Сапега ўклаў многа працы ў стварэньне Статуту ВКЛ. Пасьля Л. Сапегі засталіся ўспаміны аб тагачаснай сытуацыі ў Княстве і Маскові. Цяпер гэтыя ўспаміны існуюць ужо ў электронная форме.

**Барсучок**

## Юбілеі ў ТБК

У суботу, 1 траўня, адзначаліся два прыгожыя юбілеі сяброў ТБК: 90-гадзьдзе паважанай спадарыні Ніны Брылеўскай і 30-годзьдзе Юрася Юркевіча.

Гэтыя дзьве даты, 30 і 90, сьведчаць аб пераемнасьці пакаленьняў віленскіх беларусаў, калі старыя беларусы-віленчукі змаглі перадаць сваю эстафэту маладому пакаленьню. Сёньня можна з упэўненасьцю сказаць, што пераемнасьць пакаленьняў адбылася, што яна не перарвалася і беларускае жыцьцё гэтага Вечнага Гораду працягваецца і надалей.

Сп-ня Ніна Брылеўская была адною з самых адданых беларусак Таварыства. Нягледзячы на свае 90 гадоў застаецца бадзёрай, поўнай жыцьця, спадзяваньняў і веры ў вольную Беларусь. Нарадзілася яна 5 траўня 1920 г. у в. Лоск недалёка ад Залесься, таго самага, дзе жыў Агінскі. Пра сябе шаноўная спадарыня разказала наступнае: „Пад нямецкай акупацыяй, я працавала настаўніцай пачатковых клясаў у Лебедзеве, Смургонях, Жодзішках і ў Залесьсі. Школы былі беларускія. У школы хадзіла шмат дзяцей, па-сутнасьці, хадзілі ўсе вясковыя дзеці. У Залесьсі, напрыклад, было 7 клясаў. Пасьля прыходу бальшавікоў у Залессі зрабілі дзьве школы: беларускую і расейскую.

Пры бальшавіках я зноў працавала настаўніцай у сваёй вёсцы, але нядоўга. Спачатку ў пачатковых клясах выкладала расейскую мову, пасьля ў старшых.

Мой бацька лічыўся ворагам народу, а я была членам сям'і врага народу. І ў родным раёне я ўжо не магла знайсьці сабе працу, таму вырашыла прыехаць сюды, у Вільню. Тут уладкавалася на працу бібліятэкарам у Ерузалімцы (*раён Вільні – аўт.*), а затым настаўніцай у польскіх клясах. Пасьля я захварэла і зусім не працавала, паехала лячыцца на Каўказ. Калі выздаравела, працавала ўжо бібліятэкарам у гэтай самай 14-й школе. Клясы былі на польскай, расейскай і летувіскай мовах. Калі хварэлі настаўнікі пачатковых клясаў – я іх замяняла. Акрамя таго, я яшчэ працавала сакратаром школы. І так да пэнсіі.

У нас у бацькі была зямля свая. Мелі гаспадарку. У 1939 г. у нас згарэла хата, і мы пераехалі ў Залесьсе. Мая маці памерла ў 1929 г., калі мне было 9 гадоў. Мой бацька атрымаў 10 гадоў лягероў у Карагандзе (Казахстан), пасьля вярнуўся. А пасьля благачыннага ўзяў яго працаваць дзяком, і ён працаваў яшчэ некалькі гадоў. Памёр у 1974 г. ва ўзросьце 91 году і 8 месяцаў.

З даваеннага часу мне запомніўся эпізод, калі старшыня сельсавету засёк сякераю дачку таго гаспадара, дзе ён жыў. І ніхто яго за гэта не караў. Такі час тады быў.

У Вільні апынулася дзякуючы Лявону Луцкевічу, ён мяне запрасіў, каб я памагла

*Заканчэньне на бачыне 7*

# Невядомая графіка Ўладзіслава Галубка

Калекцыянэр Анатоль Белы знайшоў невядомыя малюнкі, створаныя Ўладзіславам Галубком і ягоным зяцем Яўгенам Ціхановічам.

"Калі памёр Яўген Ціхановіч, сям'ю папрасілі забраць усе рэчы зь ягонай майстэрні, у якой ён працаваў. Дзве вялікія тэчкі з архіву аддалі ў мой музэй у Старых Дарогах, – кажа сп. Белы. – І нядаўна толькі я разабраў той архіў. Там былі малюнкі самога Ціхановіча. Але сярод іх быў і графічны партрэт невядомага чалавека, які зрабіў у 1936 годзе Ўладзіслаў Галубок".



Уладзіслаў Галубок. Партрэт невядомага чалавека, 1936 г.

У адрозьненьне ад Галубка, творы Яўгена Ціхановіча захаваліся ў вялікай колькасьці. Цікава, што знойдзеныя малюнкі створаныя ім у 1920–1930-х гадох.

Адшуканы графічны малюнак Галубка зьяўляецца адзіным вядомым на сёньня. Захаваліся толькі чатыры ягоныя карціны, пісаныя алеем. Такую знаходку Анатоль Белы называе ўнікальнай. Бо пасля палітыкі вынішчэньня нацыянальнай інтэлігенцыі, шмат што з твораў мастацтва проста не дайшло да нас.

**А. МЯЛЬГУЙ**

------

*Яўген Ціхановіч (1911-2005) — беларускі мастак. Аўтар дзясяткаў палотнаў, сярод якіх партрэты пісьменьнікаў Васіля Быкава і Ўладзіслава Галубка. Ілюстраваў кнігі. Майстра экслібрысу, адзін зь першых увёў у гэты жанр партрэт.*

*Уладзіслаў Галубок(1882-1937) — беларускі драматург, празаік, рэжысэр, актор, мастак. Першы народны артыст Беларусі. Расстраляны ў 1937 годзе.*

## Ліст у рэдакцыю

### Пішыце ў газэту

Паважаныя сяброве і сяброўкі, пішыце абавязкова ў калёнку газэты "Беларус" "Лісты ў рэдакцыю" пра грамадзкую дзейнасьць БАЗА. Толькі пісаць трэба найбольш сьцісла і разумна.

Прыйшоў найвышэйшы час паразумецца, перш у прэсе, а пасьля і ў наяўнай прысутнасьці сяброўства. Нашае грамадзтва, а ў тым ліку і чытачы "Беларуса", звыклі няспынна сварыцца і спрачацца. Рэальнасьць гэткага стану можна ахарактэрызаваць "пустым гаварэньнем на вецер". Таму яно і ня мае якой-колечы карысьці для беларускай справы. Сябры той ці іншай арганізацыі мусяць абавязкова падаваць у газэту сваю крытыку нездаровай і непраўдзівай дзейнасьці ў арганізацыі.

Дапішчыкі павінны таксама выказваць і свае пазытыўныя думкі й меркаваньні, як наладзіць грамадзкую дзейнасьць і гэтым самым узьняць беларускую нацыянальную сьвядомасьць на належную вышыню, а не займацца бязглуздымі й пустымі спрэчкамі.

Газэта ёсьць на тое, каб пакрытыкаваць недахопы, якія заўжды ёсьць у арганізацыі, а таксама асьвятліць тое, што ёсьць добрае й праўдзівае.

Абавязкам сябroom ёсьць выказваць свае засьцярогі ў арганізацыйнай дзейнасьці. Дык, калі ласка, сяброве і сяброўкі, не марудзьце – падавайце свае думкі. Трэба толькі быць абсалютна пэўнымі ў праваце вашых меркаваньняў.

**Арм**

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:56 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

**Belarusan American Association, Inc.**

✉ 166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветная сеціва: *www.baza-belarus.org* **№ 5 (532)**


## Красавіцкі сход нью-ёрскага аддзелу БАЗА

У нядзелю, 11 красавіка, адбыўся чарговы, красавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Асаблівасьцю гэтага сходу было месца правядзеньня – на прыродзе, у парку Captain Tilly Park, які знаходзіцца каля будынку Фундацыі імя П. Крэчэўскага. Эскаляцыя канфлікту, у якім сп. Вячка Станкевіч скарыстаў сваю новаздабытую пасаду старшыні Фундацыі імя П. Крэчэўскага для зьвядзеньня рахункаў з няўгодным яму кіраўніцтвам Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, увайшла ў новую фазу. Пачалося са зьмены замкоў, затым прыйшло ўвядзеньне аплаты за карыстаньне памешканьнем, у якім аддзел каля 50 год зьбіраўся бясплатна, і затым, пад прэтэкстам капітальнага рамонту, за 10 дзён да сходу аддзелу было паведамлена, што "Фундацыя доўгі час ня будзе адкрытая для грамадзкага карыстаньня. Пачатак рамонту ў пачатку красавіка". Часу на пошукі іншага памешканьня амаль не было. У выніку не заставалася нічога, як правесьці сход на вольным паветры. 11 красавіка будынак Фундацыі аказаўся зачыненым, але нішто не паказвала на тое, што ў ім ідзе рамонт. Праз вокны відаць была заўсёдная абстаноўка залі, у якой адбываліся сходы, і якая была адмыслова перабудаваная сябрамі БАЗА менавіта для сходаў аддзелу. Там-жа захоўваюцца крэслы, архіў, іншая маемасьць аддзелу.



Нашчасьце, надвор'е было выдатным, без дажджу. У парку сьвяціла сонейка, зіхацела вада ў Гусінай сажалцы, шапацела маладзенькае лісьце на дрэвах.

На пачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка азнаёміў прысутных з апошнімі падзеямі ў Беларусі, пераважна за перыяд з часу мінулага сходу. Прамоўца спыніўся на "прэзыдэнцкай" прыватызацыі ў Беларусі, што ўлучае пляны продажу такіх флягманаў індустрыі як "Нафтан", Белтрансгаз і МАЗ, і на няўдалым досьведзе з прыватызацыяй гадзіньнікавага і мотавела заводаў у Менску. Былі ўзгаданыя сьвяткаваньне Дня Волі ў Менску і затрыманьні. Была закранутая таксама трагедыя ў Смаленску, у якой загінулі прэзыдэнт Польшчы Качыньскі й шэраг вышэйшых урадоўцаў, што ляцелі на жалобную імпрэзу 70-годзьдзя Катынскага злачынства. Сп. Зайка коратка распавёў пра гісторыю забойстваў польскіх ваеннапалонных у Катыні.

У сувязі з гэтай трагічнай падзеяй сп. Сяржук Сокалаў-Воюш распавёў пра беларусаў, расстраляных у Катыні ды іншых месцах (у тым ліку ў Беларусі) поруч з палякамі ды іншымі польскімі палоннымі, і пра беларускія сьпісы Катыні, што дасюль застаюцца сакрэтнымі.

Сп. Мікалай Цімашэнка распавёў пра дзейнасьць Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы (Моладзь БАЗА) і пра ладжаную Згуртаваньнем дэманстрацыю на Дзень Волі ў Вашынгтоне, каля амбасады Рэспублікі Беларусь.

Рэдактар газэты "Беларус" Марат Клакоцкі паведаміў коратка пра газэту і заклікаў прысутных, маючых дачыненьне да журналісцкай або выдавецкай дзейнасьці, далучацца да працы па падрыхтоўцы наступных нумароў "Беларуса".

Затым адбылася шчырая нязмушаная гутарка прысутных пра тое, як жывецца беларусам у Нью-Ёрку і ў Амэрыцы, кожны меў магчымасьць выказацца і сказаць пару словаў пра сябе, сваю працу, свае зацікаўленьні і свае пажаданьні да працы Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА.

* * *

15 траўня 2010 году на Мангэтане ў будынку Дому Маракоў на 15-й вуліцы прайшоў справаздачна-выбарчы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. На сходзе адбыліся справаздачы і выбары, быў пераабраны старшынём аддзелу сп. В. Зайка і была сфармаваная новая ўправа аддзелу. Падчас сходу мелі месца спробы сп. Вячкі Станкевіча сарваць правядзеньне сходу, але яны былі марныя. Больш падрабязную інфармацыю пра справаздачна-выбарчы сход чытайце ў наступным нумары.

***Віталь ЗАЙКА***

**НАСТУПНЫ СХОД** *Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца ў* ***СУБОТУ, 12 чэрвеня 2010 г.*** *у грамадзкай залі сабору сьв. К. Тураўскага ў Брукліне па адрасу:*

***401 Atlantic Ave, Brooklyn, NY 11217***

*Пачатак сходу а* ***6:00 увечары****.*

*Даезд цягнікамі падземкі* ***A, C*** *да станцыі* ***Hoyt-Schermerhorn****, або цягніком* ***F*** *да станцыі* ***Bergen St****.*

## Уплаты ў аддзел БАЗА:

| | |
|---|---|
| М. Агароднік | .50 |
| А. Андрыевіч | .50 |
| А. Анішчык | .50 |
| С. Арыфуліна | .50 |
| В. Аўдзеева | .50 |
| Н. Баравік | .50 |
| С. Волкаў | .50 |
| А. Вяроўка | .50 |
| Н. Ганіч | .50 |
| А. Дубік | .50 |
| Н. Духовіч | .50 |
| С. Ермакоў | .50 |
| Ю. Зелепужына | .50 |
| Т. Ігнатава | .50 |
| Н. Кавалеўская | .50 |
| Н. Карповіч | .50 |
| А. Кецко | .50 |
| І. Клімаў | .50 |
| Т. Кулакевіч | .50 |
| Ю. Міцкевіч | .50 |
| К. Мурашка | .50 |
| Ю. Новічкава | .50 |
| В. Паско | .50 |
| А. Паўлючук | .50 |
| Н. Паташка | .50 |
| Н. Піваварчык | .50 |
| Р. Ражко | .50 |
| Н. Хрыпач | .50 |
| М. Цімашэнка | .50 |
| А. Шадрына | .50 |
| Р. Шарафутдзінаў | .50 |

**Шчыры дзякуй!**

## І яшчэ адна эмігрантка

Затрымалася я тут, затрымалася. А дома чакаюць родныя і нясконча-ныя справы... А дома сьпяваюць птушкі, і бягуць рэкі...І ня ведаю, чаму шукаю сваё шчасьце за мяжою, бо няспынная пульсуе ў галаве думка, няспынная думка аб ім. Чакала, марнела і казала яму, што безь яго ня мае сэнсу жыцьцё. Але-ж не паверыў, а можа не захацеў таго шчасьця – быць каханым. Так, не захацеў. Вось цяпер я ў Амэрыцы, а ён там – у Беларусі. І сэрца маё там, бо там мая Радзіма, мае продкі і маё каханьне. А жыць даводзіцца тут, на Мангэтане. І зямлю гэтаю ўспрымаю з удзячнасьцю, бо прыняла мяне такою, якою я ёсьць.

Але-ж пачну з пачатку. Чаму я паехала за мяжу? На гэта паўплывалі, з аднаго боку, аб'ектыўныя, а зь іншага – суб'ектыўныя прычыны. Па-першае, здаецца, што шчасьце заўсёды там, дзе нас няма. Цяпер я ведаю, што яно заўжды там, дзе мы, але раней я гэтага ня бачыла і лічыла: што яно няўлоўнае кружыць у паветры недзе вельмі далёка. Яно прыцягвала сваёй нязьведанасьцю, прыгодамі. Як і кожнаму чалавеку, мне хацелася знайсьці яго, сваё шчасьце.

Цяжка пачынаць жыцьцё за мяжой. Бо ніхто цябе тут не чакае, і ніхто не ўладкуе тваё жыцьцё акрамя цябе самога. І калі пачынаеш жыць адзін: тады і сталееш, і разумееш лепш сваіх бацькоў, і зь яшчэ большаю павагаю адносішся да іх, бо зрабілі яны шмат... Але-ж вярнуся да прычынаў, па якіх я паехала за мяжу. Скажу можа трохі занадта высока, бо я простая дзяўчына, якая жадае шчасьця. Але-ж можа таму і адчуваю высокае, што простая, і была ўзгадаваная ў весцы, і ў горадзе, беларускім горадзе. Я адчуваю сябе набліжанаю да ўсяго жывога і да прыроды. Перакананая, што чалавек з жывою душою ня можа ня бачыць, дзе фальш, а дзе праўда. А праблемаў у Беларусі існуе шмат. І ці вырашацца яны калі-небудзь? Палітычны рэжым, які там існуе, стварае эканамічныя і асабістыя праблемы. Мне няшмат гадоў, каб аб'ектыўна ўспрымаць сытуацыю. Але-ж і я магу сказаць, што "рыба гніе з галавы". Калі ўлада ў краіне кіруе неразумна, дык і добрага жыцьця нельга чакаць. Па-першае, гэта праблема з працаю. Карацей кажучы, у краіне не хапае рабочых месцаў. Навучаешся, напрыклад, на настаўніка, а потым працуеш на кірмашы гандляром. Хочаш быць інжынэрам, а потым табе не хапае месца на заводзе. І яшчэ горш: з заводаў звальняюць тых, хто там ужо працуе. Вельмі цяжка знайсьці сваё месца ў сёньняшняй Беларусі. Увесь сьвет імкліва мяняецца, засвойвае прагрэсіўныя тэхналёгіі і разьвіваецца, а на нашай Бацькаўшчыне час не прыносіць ніякіх пераменаў. Краіна амаль што замураваная ў сваіх межах. Калі хочаш паехаць куды-небудзь, то ўзьнікаюць праблемы з выездам і з грашама.

Калі надыдзе час выбараў, дык палова насельніцтва на іх нават ня ходзяць. А 30% з астатняй паловы падтрымаюць дзейную ўладу. І зусім не таму, што яны згодныя зь ёю, а таму што грошай мала, а сям'ю карміць трэба. І хоць амаль усе разумеюць, што ў краіне ня так, калі надыходзіць час сказаць сваё слова, дык і голасу няма, і ўжо добра так, як ёсьць. Галоўнае, каб ня было вайны.

А вайны ня будзе. Бо каму патрэбная маленькая краіна, якая ўжо амаль страціла сваю незалежнасьць, мову, дзе моладзь шукае сябе за мяжою.

Дык ці правільна я раблю, шукаючы сваё шчасьце ў іншым краі? Пытаньне не зьнікае, бо заўжды думаю аб табе, мая Беларусь, аб тваім лёсе, аб тым, што магу зрабіць для цябе, жывучы нават тут. Бо не каменнае сэрца маё, і называю сябе беларускай.

Страчана нешта,
А нешта знайшла.
Ці ў той бок я кіруюся?
Ці ўжо навек палягла?

Гэта жыцьцё не здарма
Мне пражыць надыйшло.
Дык чаму-ж сумняваюся?
І аб чым так сумую ўсё я?

Усё вырашыла, усё ўзважыла,
І калі будзе змаганьне,
І калі будзе мэта,
Дык нельга і разважаць.

Ці ня цуд, ці не таямніца,
Усе, што трэба нам перажыць.
Дык з мэтай уперад,
І нельга назад пазіраць.

Уперад вочы і мэты ўперад –
Калі ласка за мной!
Калі верым, што ўсё мы здолеем перажыць.
Калі верым, што ўсё здолеем мы збудаваць!

***Надзея БАНДАРОНАК***

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:57 PM Page 8



**Нашая фанатэка**

# 50 выканаўцаў – 50 адкрыцьцяў



У пачатку красавіка ў канфэрэнц-залі менскага Палацу мастацтваў адбылася прэзэнтацыя новага мультымэдыйнага дыску "Барды Свабоды", які быў выдадзены паводле зьместу аднайменнай радыёперадачы, што ўжо амаль год гучыць на хвалях "Радыё Свабода".

Ініцыятар і нязьменны вядучы перадачы, вядомы беларускі бард Зьміцер Бартосік перад пачаткам прэзэнтацыі зазначыў: "Сёньня мы прадстаўляем слухачам мультымэдыйнае выданьне "Барды Свабоды". Праграмы з аналягічнай назвай выходзілі на "Радыё Свабода" зь верасьня 2008 году. На яе хвалях прагучалі кампазыцыі каля сотні аўтараў-выканаўцаў. Для мяне было вялікім адкрыцьцём, што ўсё больш маладых бардаў аддаюць перавагу беларускамоўнай творчасьці. Праўда, большасьць зь іх пакуль выступае па "кватэрніках" ці ў невялікіх клюбах...

І вось большасьць з гэтых выканаўцаў удалося сабраць пад адной вокладкай дыску "Барды Свабоды", а таксама на гэтай прэзэнтацыі. Калі-б мне дзесяць гадоў таму сказалі, што ў Беларусі будуць выконваць свае песьні больш за сто беларускамоўных бардаў, а іх кампазыцыі можа будзе зьмясьціць на адзін дыск, то я-б не паверыў! І вось сёньня мы прадстаўляем слухачам першы том гэтай своеасаблівай анталёгіі сучаснай беларускамоўнай бардаўскай песьні. А гэта 50 аўтараў, якія спэцыяльна для гэтага выданьня запісалі па 5 песень. Гэтыя кампазыцыі гучалі на хвалях перадачы "Барды Свабоды" цягам году".

Складальнікі дыску – Зьміцер Бартосік і Ягор Маёрчык – зрабілі шмат, каб дыск успрымаўся ня толькі як анталёгіяй творчасьці айчынных бардаў, але і набыў энцыкляпэдычныя рысы. Бо для шматлікіх маладых аўтараў-выканаўцаў бардаўскай песьні кружэлка "Барды Свабоды" стала дэбютнай. Вось таму музычныя трэкі кожнага барду суправаджаюцца біяграфічнымі зьвесткамі, кароткім расповедам пра творчасьць таго ці іншага выканаўцы, дыскаграфіяй, калі такая маецца ў яго. Таксама на дыску запісаныя інтэрвію з бардамі, ёсьць асобны файл з фатаздымкамі ўсіх удзельнікаў праекту. Нягледзячы на вялікі аб'ём інфармацыі, які прадстаўлены на кружэлцы, карыстацца гукавымі і інфармацыйнымі файламі выданьня проста і зручна. Акрамя 250 песень беларускіх бардаў на кружэлцы былі зьмешчаныя і літаратурныя творы, якія былі выдадзены беларускай службай "Радыё Свабода". У фармаце PDF можна пачытаць такія кнігі як "Быкаў на Свабодзе", "Беларуская Атлянтыда" Вячаслава Ракіцкага, "Вострая Брама" Сяргея Дубаўца, "Дуліна ад Барадуліна" Рыгора Барадуліна, публіцыстычныя і паэтычныя зборнікі "Адзін дзень палітвязьня", "Верш на Свабоду" і іншыя выданьні.

Але вяртаючыся да канцэрта-прэзэнтацыі новага мультымэдыйнага выданьня, зазначым, што яе распачаў кіраўнік беларускай службы "Радыё Свабода" Аляксандар Лукашук. Ён зьдзівіў слухачоў тым, што сам, узяўшы ў рукі гітару, выканаў вельмі экспрэсіўную і зьмястоўную кампазыцыю, блізкую да канонаў рэпу – песьню "Хор бардаў". Дарэчы, гэты твор запісаны на дыску "Барды Свабоды".

Наступны ўдзельнік прэзэнтацыі – былы ўдзельнік гурта "Камэлот", а цяпер бард і вольны дудар Зьміцер Сідаровіч прапанаваў слухачам свае вядомыя па ранейшых выступах песьні. Адна зь іх – "Пена цёмнага піва" была, як заўсёды, прынятая слухачамі зь вялікім энтузіязмам. Карыстаючыся выпадкам, Зьміцер запрасіў ўсіх жадаючых паўдзельнічаць у беларускіх скоках ў сталічнай кавярні "Жарптушка", дзе ён грае на дудзе, а таксама паведаміў, што ўжо падрыхаваная да выданьня першая кружэлка музыкі – "Дзіцячы альбом".

Наступны ўдзельнік прэзэнтацыі – бард, мультыінструменталіст і зьбіральнік народных інструмэнтаў Яраш Малішэўскі аддаў перавагу клясычным вершам Ларысы Геніюш, прыхільнасьць да якіх Яраш выявіў яшчэ падчас працы над праектам "Ларыса Геніюш. Жыць для Беларусі". Адзначылі бурнымі воплескамі слухачы і лірычны твор Яраша "Любая Марына".



Яраш Малішэўскі

Калі гаварыць пра адметнасьці песеннай творчасьці вядомага паэты і барда Андрэя Хадановіча, то яго творчы мэтад можна назваць постмадэрнісцкім сьцёбам пад мэлёдыі сусветнавядомых гітоў. Так, музыка карыстаецца (і гэта ён не хавае ад слухачоў) эвэргрынамі, кшталту мэлёдыяў Эдзіт Піяф альбо "Besame mucho", напаўняе іх тутэйшымі рэаліямі, як гэта можна будзе адчуць у фантазіі на тэмы песень Т. Кутуньё і А. Ярмоленкі "Італьянскі базар" ці ў песьні "Безь цябе не прасыхаю" паводле гіта Стыві Ўандэра, што гучаць на дыску.

Вялікую частку праграмы дыску складаюць творы беларускіх рок-музыкантаў, якія па розных прычынах бяруць ў рукі акустычныя гітары і становяцца на шлях бардаўскага выканаўцы. Сапраўды, гэтай каляінай рушаць "энэрэмаўцы" Лявон Вольскі і Піт Паўлаў, беластоцкая рок-сьпявачка Ілёна Карпюк, менскія блюзавыя музыкі Андрэй Плясанаў і Юры Несьцярэнка... Дарэчы, апошні зь пералічаных выканаўцаў на прэзэнтацыі трымаў слова за ўсіх рок-бардаў Беларусі. Ягоныя творы, сапраўды, напоўнены блюзавымі і рок-н-рольнымі інтанацыямі. Але ў той-жа час, песьні Юрыя адрозьніваюцца шчырымі эмоцыямі і глыбокім філязофскім сэнсам. Гэтым крытэрам адпавядала кампазыцыя "Агні гарацьь" на верш Л. Рублеўскай. Як і зьмешчаны на дыску кавэр "Дождж" на песьню лідэра амэрыканскага гурта "Creedence Clearwater Revival" Джона Фогенці, пераклад якой на беларускую мову зрабіў Юры. На прэзэнтацыю Ю. Несьцярэнка прыйшоў таксама не з пустымі рукамі: пабачыў свет "жывы" альбом зь блюзавымі стандартамі і кампазыцыямі Ю. Несцярэнкі і ягонага гурта White Night Blues пад назвай Live in Poland. Шкада, што астатнія беларускія рок-музыканты не знайшлі часу завітаць у Палац мастацтваў на прэзэнтацыю "Бардаў Свабоды"...



Юры Несьцярэнка

Паэт Анатоль Кудласевіч у бардаўскім асяродзьдзі вядомы тым, што ў 1993 годзе ўпершыню ўзяў на сябе клопат і стаў адным з арганізатараў першага фэстывалю беларускамоўнай бардаўскай песьні. Ад таго фэсту прайшло шмат часу, але Анатоль не закінуў гітару і працягвае сваю бардаўскую творчасьць, рыхтуе да выданьня першую аўтарскую кружэлку. На прэзэнтацыі-ж Анатоль нагадаў слухачам адну са сваіх музычных візітовак – кампазыцыю "Атрасіны" на верш паэта Славаміра Адамовіча. Да таго-ж, слухачы з прыхільнасцю прынялі і іншы твор А. Кудласеча – кампазыцыю паводле "турэмнага цыклю" Якуба Коласа "Песьню няволі".

Кастусь Герашчанка, кіраўнік народнага вакальнага гурта "Пліса" з аднайменнага беларускага мястэчка Глыбоцкага раёну Віцебскай вобласці, вядомы і як бард. Сталы ўдзельнік разнастайных музычных імпрэзаў у сталіцы, Кастусь з цягам часу зрабіўся актыўным удзельнікам айчыннага бардаўскага руху. Таму слухачы вельмі прыхільна прымалі ягоныя творы, асабліва драматычную па сваім сэнсаваму напаўненьню песьню на верш Анатоля Сыса "У гэтай краіне". Настальгічныя ноты журбы па простаму вясковаму ладу жыцьця прагучалі ў кампазыцыі "Студня", якую бард стварыў на верш З. Марозава.



Кастусь Герашчанка

Вялікім поспехам у аматараў айчыннай бардаўскай песьні карыстаецца і яшчэ адзін прадстаўнік рэгіянальная плыні бардаўскіх выканаўцаў – Сяргей Верамейчык, які жыве і працуе ў Залесьсі. Гэтаму мястэчку, дзе быў створаны знакаміты "Палянэз Агінскага", аўтар прысьвяціў своеасаблівы гімн – кампазыцыю "Гукі Залесься". Зь ёю можна пазнаёміцца на кружэлцы. Творы Сяргея – абразкі жыцьця беларускай глыбінкі, напоўненыя тонкім гумарам, мэлядычнай лёгкасьцю і пазытыўным поглядам на мясцовыя жыцьцёвыя рэаліі. Напрыклад, "Байка" распавядаецца ад асобаў тых жывёлаў, якія пасьвяцца на палетках князя Агінскага. А гумарыстычная баляда "Да нядзелькі" – гульлівая аповесьць пра акалічнасьці жыцьця беларускай правінцыі "ад панядзелка да нядзелькі", дзе ёсьць усё: і праца ў будні, безаглядная весялосьць, скокі па выходных і сьвятах.

Як заўсёды, шчырыя воплескі слухачоў выклікала творчасьць Тацьцяны Беланогай. Песьні "Звычайнае каханьне" і "Зіма. Вакзал" былі напоўненыя непадробнымі пачуцьцямі і жаноцкасьцю, лірычным харством паэтычных радкоў. Гэтымі творамі Т. Беланогая заінтрыгавала шматлікіх слухачоў, як і тым, што хутка пабачыць сьвет яе новы альбом "Ніткі".

Арганізатары праекту "Барды Свабоды" як адну з галоўных ставілі перад сабою мэту актывізаваць беларускамоўную творчасьць маладых аўтараў і выканаўцаў. Дзеля гэта быў заснаваны конкурс для пачынаючых пад назвай "Гітара Свабоды". І вось пад час прэзэнтацыі былі падведзеныя ягоныя вынікі, і вядучы канцэртнай праграмы і радыйнага варыянту "Бардаў Свабоды" Зьміцер Бартосік ўручылі прызы пераможцам – акустычныя гітары!

Гэтымі цудоўнымі інструмэнтамі былі ўзнагароджаныя маладыя аўтары: Марыя Новікава, Дар'я Кадамская, Алесь Зайцаў, Раман Яраш і іншыя пэрспэктыўныя бардаўскія выканаўцы. Іхныя песьні, што запісаныя на гэтым дыску, а таксама аўтарскае іх выкананьне падчас прэзэнтацыі, засьведчылі высокі творчы патэнцыял аўтараў, якія, спадзяюся, ў хуткім часе стануць у адзін шыхт з клясыкамі айчыннай бардаўскай песьні.

*Анатоль МЯЛЬГУЙ*
*http://mialguj.livejournal.com*

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:57 PM Page 9



# Вера РАМУК

## 06.09.1931 - 05.05.2010



Беларуская супольнасьць у нашай краіне і ва ўсім сьвеце панесла вялікую страту: 5 траўня 2010 году ў Чыкага пасьля нядоўгай хваробы памерла Вера Рамук, вельмі актыўная дзеячка нашага эміграцкага асяродзьдзя ў другой палове мінулага і ў пачатку цяперашняга стагодзьдзя.

Яна нарадзілася 6 верасьня 1931 году у Сабарах (тады гэта была Польшча, цяпер – Докшыцкі раён на Віцебшчыне, блізка ад Глыбокага) ва ўніяцкай сям'і Стэфана Жызьнеўскага і Еўдакіі Гапанёнак. Пасьля ўзьяднаньня Беларусі Жызьнеўскія былі сярод тых, каго "плянавалі" выслаць у Сібір. Потым была нямецкая акупацыя, і ў 1944 годзе сям'я пераехала ў Нямеччыну. Адтуль у 1949 годзе яны перабраліся ў Злучаныя Штаты Амэрыкі.

Спачатку жылі ў гарадку Пэорыя ў штаце Ілінойс. Там Вера закончыла факультэт вольных навук ва Ўнівэрсытэце Брэдлі (1954). Брала актыўны ўдзел у студэнцкім жыцьці, у розных аўдыторыях распачынала свае роспаведы пра Беларусь і яе народ, ужо там арганізавала жаночы ансамбаль беларускага танцу. Пазнаёмілася з доктарам Вітаўтам Рамуком, таксама вельмі актыўным эмігрантам з радзімы. У 1958 годзе яны пабраліся шлюбам.

У 1963 годзе Вера і Вітаўт Рамукі пераехалі на сталае месца жыцьця ў Чыкага. Неўзабаве яны разгарнулі ў гэтым горадзе вельмі актыўную грамадзкую дзейнасьць, мэтай якое было аб'яднаньне тых, хто прыехаў зь Беларусі. Многае ўдалося зрабіць: Беларускі Каардынацыйны Камітэт, які ўзначальвалі Вітаўт і Вера Рамукі, злучаў у цікавых агульных грамадзка-культурных мерапрыемствах беларусаў, што гуртаваліся вакол уніяцкай парафіі Хрыста Збаўцы і праваслаўнай царквы сьвятога Юр'я. Дзякуючы спадарыні Веры да многіх падзей далучаліся і тыя, хто прыяжджалі ў эміграцыю зь Беларусі ў 90-я гады і пазьней. Вера Рамук сваёй адкрытай шчырасьцю і няспыннай дзейнасьцю аб'ядноўвала многіх, хто не забыўся пра радзіму, незалежна ад паходжаньня і веравызнаньня, – і гэта, як уяўляецца, мае і сёньня асаблівае значэньне.

Вера Рамук была ініцыятаркаю многіх сустрэчаў з палітыкамі і грамадзкімі дзеячамі ЗША, увага якіх зьярталася на палітычнае становішча ў Беларусі, на стаўленьне ўладаў да беларускае мовы і культурнай спадчыны, на спрадвечныя спадзяваньні беларусаў быць вольнымі і незалежнымі. Яна сустракалася з прэзыдэнтам Рэйганам, перапісвалася з прэзыдэнтамі Клінтанам і Бушам і многімі іншымі палітычнымі дзеячамі ў Вашынгтоне і ў штаце Ілінойс. У 1974 годзе Вера Рамук зь вялікай групай выхадцаў зь Беларусі сустракала і вітала славутага беларускага мастака Марка Шагала на адкрыцьці ў цэнтры Чыгага яго-най мазаікі "Часіны году" – найвыдатнейшага ў сьвеце шэдэўру выяўленчага мастацтва. Яна арганізоўвала экспазыцыі твораў мастакоў і канцэрты музыкаў, што прыехалі сюды зь Беларусі, рыхтавала выданьне розных кніжак зь беларускай побытавай тэматыкай, ініцыявала рэгулярную выставу беларускіх навагодніх ялінак у мэрыі Чыкага і ў офісе графства Кук, прымала актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і абавязковым штогадовым сьвяткаваньні ў сакавіку нашага Дня Волі. Многія, хто прыязджаў зь Беларусі ў Чыкага, лічылі за гонар пабываць у доме Рамукоў, пагутарыць зь імі... Вера Рамук пісала цудоўныя вершы, – гэты кірунак яе дзейнасьці патрабуе асобнай гаворкі.

Сталася так, што 9 сакавіка памёр Вітаўт Рамук, а амаль праз два месяцы пайшла з жыцьця і спадарыня Вера. Выказваем шчырае спачуваньне іхняй дачцэ Ірэне, сыну Джону, унукам і ўсім родным і блізкім гэтых цудоўных і значных асобаў. Памяць аб Веры і Вітаўце Рамуках будзе жыць доўга ў сэрцах тых, хто іх ведаў, у сэрцах усіх, каму не абыякавая ідэя захаваньня беларускай культурнай і ідэйнай спадчыны, беларускай самасьвядомасьці.

*В. НІКІФАРОВІЧ*

# Ларыса ГЕНІЮШ

## 1910 — 2010

*У вянок памяці*

## Пару развагаў з амэрыканскага берагу ў памяць Ларысы Геніюш

*Бласлаўлёна тая зямля*
*і быць Ёй свабоднай вечна,*
*што брацьцям маім прытулак дала*
*ў сям'і сваёй чалавечнай!*

*And may that land forever be blest*
*Rejoicing in freedom unending*
*Which gave to my brethren a haven of rest*
*In that human family befriended.*

Першы зборнік паэзіі Ларысы Геніюш "Ад родных ніў" (1942 г.) быў зрыхтаваны й давядзены да друку доктарам Вітаўтам Тумашам. Быўшы чалавекам падзвычай сьціплым, др. Тумаш пра гэтую падзею вельмі мала гаварыў. А аднойчы выказаўся так: "Рабіў усё мажлівае, каб зборнік выдаць, бо ўсьведамляў, як гэта важна для беларускай літаратуры."

З Ларысай Геніюш у др. Тумаша была цэлая зьмястоўная перапіска. Паэтка прысьвяціла яму верш і не адну згадку ў сваёй пісьмовай спадчыне.

Але "амэрыканскі" вэктар увагі Ларысы Геніюш засярэдзіўся і на іншай падзеі. Напярэдадні 200-годзьдзя Злучаных Штатаў, калі мы рыхтаваліся да юбілейнага фэстывалю ў Нью-Джэрзі, Ларыса Геніюш прыслала беларусам ЗША ёю зробленую пасьцілку ды прысьвяціла Амэрыцы вышэй выдрукаваны верш, які рэдактар Сяргей Шупа ўставіў як эпіграму ў маю кнігі "Беларусы ў ЗША". Нябожчыца Вера Рыч, заглыбіўшыся ў пачуцьці Ларысы Геніюш, пераклала гэтыя прачулыя радкі ў ангельскую мову.

*Вітаўт КІПЕЛЬ*

# Зоя СМАРШЧОК-ЖАЛЯЗОЎСКАЯ

## 1922 - 2010

Беларуская дзяячка ў Бэльгіі Зоя Смаршчок-Жалязоўская адышла да Госпада 3 красавіка сёлета.

Нарадзілася яна 15 сьнежня 1922 году ў вёсцы Стараельня Кашалеўскай гміны Наваградзкага ваяводзтва. У час Другой сусветнай вайны яна ўступіла ў шэрагі Саюзу Беларускай Моладзі. Гэта стала прычынаю таго, што з наступленьнем Чырвонай Арміі яна была вымушаная зьехаць у Нямеччыну. Пасля заканчэньня вайны засталася ў Нямеччыне і неўзабаве пераехала ў Бэльгію. Там паступіла ў Лювэнскі каталіцкі ўнівэрсытэт, пасьля завяршэньня якога атрымала дыплём фармацэўта.

Яшчэ ў студэнцкія гады яна далучылася да беларускага патрыятычнага руху, стаўшы сябрам Згуртавання беларускіх студэнтаў Бэльгіі, заснаванага ў 1948 годзе. У 1950 годзе выйшла замуж за свайго калегу па Лювенскім унівэрсытэце беларуса Аўгена Смаршчка, які ў хуткім часе стаў праваслаўным сьвятаром.

Пры закладаньні Беларускай грэкакаталіцкай парафіі ў Антвэрпэне ў 2002 годзе яна аказала моцную маральную падтрымку і сталася дабрадзейкай парафіі.

У 2004 годзе яна была адною з арганізатараў і ганаровых удзельнікаў зьезду новай хвалі эміграцыі ў Антвэрпэне, і ў наступныя гады актыўна ўдзельнічала ва ўсіх імпрэзах, арганізаваных беларускай эміграцыяй.

Адпяваньне адбылося паводле праваслаўнага абраду 10 красавіка ў каталіцкай царкве Найсьвяцейшай Багародзіцы ў Гэвэры каля Лювэну. Пахавалі нябожчыцу ў сямейным склепе на тамтэйшых могілках, дзе ўжо 26 гадоў спачывае яе муж – святар Аўген Смаршчок.

*Паводле bielarus.eu*

# Весткі зь Вільні

*Заканчэньне з бачыны 4*

там у бібліятэцы. Паколькі я канчала бібліятэкарскія курсы і мела пасьведчаньне, то мяне і ўзялі на працу.

З Луцкевічам я пазнаёмілася дзякуючы майму брату ў час вайны. Луцкевічы ехалі ў Берасьце, каб уладкавацца на працу і начавалі ў майго брата ў Лебедзеве, там і пазнаёміліся.

Была знаёмая і з кс. Гадлеўскім, якога спаткала ў Смургонях. Ён там начаваў. Мой брат пры немцах быў старшынём Смургонскага раёну (бурмістрам). І Гадлеўскі ў нас начаваў. А пасьля яшчэ Гадлеўскі прыяжджаў у Жодзішкі. Там у касьцёле сабралася вельмі шмат народу, і ён маліўся па-беларуску. Народ ведаў пра гэта загадзя, таму і прыйшло шмат людзей. Пасьля яшчэ прыехалі з Менску артысты і там сьпявалі „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Гэтым хорам кіраваў арганісты Трызна, але потым яго забілі польскія партызаны.

Акрамя Гадлеўскага, памятаю, што бацька Зоі Коўш быў бацюшкам і прыяжджаў у Залесьсе і па-беларуску казаў казаньні і маліўся. Яго забілі пасьля. Невядома, хто яго там расстраляў.

У нас у Лебедзеве начаваў Іваноўскі. Я яго нават частавала аладкамі. І ён сьпяваў: „Кожны дзень бліны, а ў нядзелю таюны". А што гэта за таюны, я і ня знаю. Размаўляў ён па-беларуску ў нас. Ехаў у Менск на машыне і ў нас пераначаваў. Высокі такі быў, прыгожы. Машынай сам не кіраваў, быў у яго шафёр.

Як тут стварылася Таварыства Беларускай Культуры, я далучылася да ягонай працы. Увесь час цікавілася беларускім жыцьцём. Мне самой вельмі прыемна, што я магу нешта зрабіць для бібліятэкі ТБК і самой арганізацыі. Я старалася і зрабіла картатэку, кожная кніжка там запісаная была.

Шкода, што адышлі многія сябры Таварыства, лепшыя людзі, беларусы. 15 асобаў налічыла. Цяпер спадзявацца трэба на маладых".

Павіншаваць сп-ню Ніну Брылеўскую прыйшло шмат сяброў Таварыства. Важна зазначыць, што гэтым разам былі і старэйшыя беларусы-віленчукі, тыя, хто стаялі ля вытокаў ТБК: Леакадыя Шышэя, Зінаіда Кароль і інш. На жаль, іх засталося няшмат. Але зараз, нягледзячы на сталы ўзрост, яны змаглі прыйсьці, павіншаваць юбіляраў.

Зінаіда Кароль парадавала прысутных прыгожым выкананьнем беларускіх песень, якія сьпяваліся ў розны час, у тым ліку і ў ТБК.

Другі юбіляр – гэта Юрась Юркевіч, новы сябра ТБК, які ўліўся ў арганізацыю зусім недаўна. Ён актыўна ўдзельнічае ў жыцьці Таварыства, выступае на шматлікіх імпрэзах з грунтоўнымі дакладамі. Варта дадаць, што пасьля сьмерці Юрыя Гіля ён пераняў на сябе кіраўніцтва Таварыствам Беларускай Мовы Віленскага краю. Хацелася-б яму пажадаць плённай працы на карысьць беларушчыны Віленскага краю.

І, думаю, ня поўным будзе апавяд пра сьвяткаваньне двух юбілеяў, калі не дадаць, што шыкоўны стол, за якім яны адзначаліся, быў арганізаваны за кошт Юрася Юркевіча.

Хочацца пажадаць паважаным юбілярам доўгага і плённага служэньня на карысьць дарагой нам усім Бацькаўшчыны. Пакуль ёсьць мы – ёсьць яна. І важна яшчэ захаваць пераемнасьць пакаленьняў, якая тут, у Вільні, адбылася.

*Алесь АДАМКОВІЧ*

Copy of Bielarus568.qxd 5/20/2010 10:57 PM Page 2



# КУПАЛЬЛЕ

**Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі суродзічаў на ўлоньні прыроды.** Купальскі вечар пачнецца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы далучайцеся да нас. Пачастуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 27 лекавых траваў. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную ноч.

**Калі:** **18-20 чэрвеня 2010 году** (Купальская ноч у суботу 19 чэрвеня).

**Дзе:** Парк ***Ward Pound Ridge Reservation*** у ***Cross River, NY 10518***

**Транспарт:** цягнікам са станцыі ***Grand Central*** да прыпынку ***Katonah***. Гэта прыкладна гадзіна язды цягніком ад Мангэтану на ***Metro North, Harlem Line***.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям. Чэкі выпісвайце на ***Mr. & Mrs. Ryzy*** з адзнакаю "***Купальле***" і дасылайце разам з формаю, надрукаванаю ніжэй, на адрас:

***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Кантакты:** **Пётра** і **Алена РЫЖЫЯ**, тэл. **(914) 522 - 0742**, эл. пошта: ***LenaBelarus@aol.com***

**Што будзе:** купальскія песьні й танцы на працягу ўсёй ночы, спартовыя спаборніцтвы й гульні, гатаваньне страваў (прыносьце ежу, грылі там будуць).

**Захапіце з сабою:** - беларускія строі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам - доўгія спадніцы, хлопцам - доўгія сьветлыя штаны, ня шторты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу, напоі, спальныя мяшкі, намёты, калі будзеце спаць;
- **$8** (з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў) за ўезд у парк (бясплатна пасьля 5-й гадзіны вечара).

Арганізатары забясьпечаць пітную воду і паліва для вогнішчаў і грыляў.

**УВАГА! Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек, таму дасылайце рэгістрацыі загадзя.**

**Імя:** ____________________________

**Дарослых ($25):** ___, **дзяцей ($10):** ___ **Усяго дасылаю: $** ____

**Ваш тэлефон:** ____________ **E-mail адрас:** ____________

**Паштовы адрас:** ____________________________

____________________________

**Ці трэба Вас забіраць з прыпынку цягніка?**___ **Калі?** ______

**Ці даслаць Вам мапу з інструкцыяй, як даехаць да парку?** _____

# ПАДПІСКА

## на выданьні зь Беларусі на другую палову 2010 году

## З дасылкаю зь Беларусі ў замежжа:

| | Назва, выдавец, мова | Пэрыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 75 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 32 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 100 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 32 |

## Жыхарам Беларусі:

(Зрабіце вартасны калядны падарунак сваім родным ці знаёмым у Беларусі - выпішыце ім беларускія выданьні, аплаціўшы выдаткі ў ЗША)

| | Назва, выдавец, мова | Пэрыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 20 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 8 |
| | **Народная Воля**, прыват., бел., рас. | 16 на месяц | 25 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 25 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 12 |
| | **Краязнаўчая газэта**, беларуская | 4 на месяц | 12 |

Вы можаце выпісаць і іншыя выданьні зь Беларусі. Па інфармацыю зьвяртайцеся на адрас: ***hazetabielarus@att.net***

***Заўвага:*** *газэты дасылаюцца авіяпоштаю, часапісы звычайнаю.*

***Дасылайце замовы на падпіску і аплату да 15 чэрвеня 2010 г. на адрас:***
***BIELARUS, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735.***
***Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя BIELARUS.***

**Шаноўнае спадарства!** Нагадваем, што 31-га траўня 2010 году заканчваецца тэрмін збору твораў для альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа **"БЕЛАРУС 2010"**.

Зьмясьціць свае творы ў альманаху маюць права аўтары, якія пішуць па-беларуску ў розных літаратурных накірунках. Адзінае патрабаваньне – аўтары павінны жыць па-за межамі Беларусі.

Плануемы час выхаду альманаху ў сьвет – жнівень 2010 году.

Свае творы аўтарам найлепш дасылаць электроннаю поштаю на адрас: ***hazetabielarus@att.net*** У выключных выпадках, калі аўтары ня маюць доступу да сусьветнага сеціва, творы можна даслаць поштаю запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на адрас рэдакцыі:

***BIELARUS / P. O. Box 3225 / Farmingdale, NY 11735 USA***

Тэксты пажадана пісаць тарашкевіцай. Творы напісаныя наркамаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай.

Кожнаму аўтару, хто вырашыць даслаць свае творы, пажадана таксама даслаць свой партрэтны здымак і кароткую аўтабіяграфію і, калі захочуць, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі-б паведаміць сваім чытачам.

З пытаньнямі кантактуйце рэдакцыю. Жадаем посьпехаў!

Амэрыканскае Таварыства Славістычных Дасьледаваньняў (***American Association for the Advancement of Slavic Studies***) у сваім часапісе ***NewsNet*** за сакавік 2010 г. падало да ведама пра **ўзнагароды Фонду памяці Зоры Кіпель** за найлепшую беларусаведную кнігу ($500) і артыкул ($200), што былі апублікаваныя (па-беларуску або па-ангельску) у пэрыядзе 2005-2009 гадоў.

**Фонд памяці Зоры Кіпель** прысуджае таксама **прэміі** за найлепшыя неапублікаваныя беларусаведныя артыкулы (мінімум 15 старонак) студэнтаў у каледжах або ўнівэрсытэтах ЗША.

Узнагароды прызначае камісія ў складзе сяброў **Паўночна-Амэрыканскага Беларусаведнага Таварыства** (***North American Association for Belarusian Studies***. See: http://www.belarusianstudies.org). Каб удзельнічаць у конкурсе, не абавязкава быць сябрам гэтага таварыства. Па дэталі конкурсу трэба зьвяртацца на наступны адрас:

***Dr. Curt Woolhiser***
***Harvard University***
***Department of Slavic Languages and Literatures***
***Barker Center 327***
***12 Quincy St.***
***Cambridge, MA 02138-3804.***
*E-mail:* ***cwoolhis@fas.harvard.edu***; *tel.* ***(617) 4895-3528.***

***Газэта "БЕЛАРУС" бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й аб'явы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш.***
***Накнот разьмяшчэньня рэкламы кантактуйце рэдакцыю.***

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:

А. Кіпель ................240
Г. Аўсейчык ...............60
А. Андрыевіч ...............50
С. Арыфуліна ...............50
С. Волкаў ...............50
А. Выхадцэва ...............50
Н. Ганіч ...............50
Б. Данілюк ...............50
Н. Духовіч ...............50
С. Ермакоў ...............50
Ю. Зелепужына ...............50
Т. Ігнатава ...............50
Н. Карповіч ...............50
А. Кецко ...............50
І. Клімаў ...............50
Ю. Міцкевіч ...............50
Ю. Новічкава ...............50
Н. Піваварчык ...............50
Р. Ражко ...............50
Н. Хрыпач ...............50
О. Яскевіч ...............50
В. Ваксеііс ...............15

Заміж кветак на магілу Вітаўта РАМУКА:
Я. і К. Вініцкія ...........100

Заміж кветак на магілу Джона КУЛЬБЯДЫ:
Я. і К. Вініцкія ...........50

Усім шчыры дзякуй!

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць пагляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**

**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**
© BIELARUS, 2010

**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***
ISSN 1054-9455

**Адказнасьць за зьмест рэкламы нясе рэкламадаўца.**